# Асаблівасці методыкі вывучэння словазмянення і праца над сэнсавым бокам слова

- Вучні дапаможнай школы пачынаючы з 1 класа засвойваюць першапачатковыя веды пра слова, сказ і тэкст. Яны атрымліваюць першаснае ўяўленне пра форма- і словаўтварэнне, лексіка-граматычныя разрады слоў на аснове розніцы намінатыўнай функцыі слоў (іх значэння), праз сувязь значэння і формы. У далейшым праца над фарміраваннем паняцця пра часціны мовы, іх словазмяненне таксама цесна звязана з працай над сэнсавым бокам слова.

- Ужо ў 1 класе вучні знаёмяцца з назвамі прадметаў. Яны знаёмяцца з паняццямі “адзін прадмет” – “многа прадметаў” пры дапамозе малюнкаў *(“Дзе шар, а дзе шары?”*). Гэтая работа працягваецца ў 2 класе, але вучні арыентуюцца ўжо не на малюнкі, а на напісанае слова: яны вызначаюць, якое слова абазначае адзін прадмет, якое – многа. Для засваення катэгорыі ліку ў 2 класе выкарыстоўваюцца табліцы з малюнкамі прадметаў (аднаго і многіх) і подпісамі. На табліцах выдзяляюцца канчаткі.
- Катэгорыя ліку з’яўляецца даволі простай для засваення, бо яна звязана з рэчаіснасцю. Акрамя таго, ў беларускай мове сістэма канчаткаў назоўнікаў у Н. скл. множнага ліку нескладаная: назоўнікі маюць канчаткі *-і* або *-ы*.

- Больш складанай з’яўляецца праца над родам слоў, таму што гэтая граматычная катэгорыя не заўсёды звязана з прадметным зместам (акрамя адушаўлёных назоўнікаў, якія называюць жывых істот, людзей па полавай прыналежнасці: *Іра, Алег, настаўнік, настаўніца*).
- Засваенне катэгорыі роду ў 3 класе пачынаецца менавіта з такіх слоў.
- Але падрыхтоўка пачынаецца яшчэ ў 1 класе, калі вучні адказваюць на пытанні: *Каго мыла Маша? Каго мыў Віця?* (Так фарміруецца ўменне ўжываць дзеяслоў у форме пэўнага роду ў прошлым часе.)

- Пачынаючы з 3 класа дзеці размяркоўваюць словы па пытаннях з выкарыстаннем займеннікаў *мой, мая: мая мама, мой бацька, мая бабуля*. Лепей пачынаць з назваў сваяцтва і назваў некаторых відаў жывёл: *курыца, певень*. Заданні павінны насіць камунікатыўны характар, каб дзеці ў пэўнай маўленчай сітуацыі адказвалі на пытанні настаўніка, ужываюць назоўнікі з займеннікамі.
- Затым вывучаецца род неадушаўлёных прадметаў: "*Гэта твая кніга? – Так, гэта мая кніга*".
- Пачынаючы з 4 класа дзеці называюць прыметы прадмета па пытаннях *які? якая? якое? якія?* Такім чынам засвойваецца род назоўнікаў і канчаткі прыметнікаў у формах рознага роду.

- Самай складанай з’яўляецца катэгорыя склону.
- Навучанне дзяцей правільнаму ўжыванню словаформ вядзецца ўжо ў 1 класе. Дзеці вучацца будаваць сказы, у якіх выражаюцца значэнні аб’екта дзеяння (*Вася ўзяў кнігу*), месца і напрамку (*Дзеці ідуць у школу*), прыналежнасці (*У Машы лялькі*). У 2 класе колькасць слоў пашыраецца. Выкарыстоўваюцца практычныя дзеянні: *Міша, пакладзі кнігу. – Куды паклаў кнігу Міша? – Міша паклаў кнігу ў стол.* З 3 класа дзеці назіраюць за змяненнем слоў у залежнасці ад пытання, вучацца ставіць пытанні да слоў у сказе (*над чым? дзе? аб чым?* і інш.).

У 6 класе вучні ДШ знаёмяцца з назвамі склонаў і змяненнем назоўніка па пытаннях.

- Існуюць розныя прыёмы.
- 1) Метад "фразавага" скланення. На агульных фразах дзеці вывучаюць, як правільна ставіць склоны
- Н.скл. У мяне ёсць (кніга).
- Р. скл у мяне няма (кнігі).
- Д. скл. Хачу падарыць (кнігу).
- В.скл. Я бачу (кнігу).
- Т. скл. Я цікаўлюся (кнігай).
- М. скл. Я гавару аб (кнізе).
- 2) Выкарыстанне звязных тэкстаў у якіх выкарыстоўваюцца ўсе формы прапанаванага слова. Мой сусед - *мастак*. *Мастака* ні было дома… Дзеці вучацца ставіць пытанні да слова.
- 3) Складанне звязных тэкстаў па падабраных пытанняў.

Працуючы над склонавымі формамі назоўніка, варта ствараць сітуацыі рэальнага дзеяння, напрыклад, адказ на пытанні настаўніка з ужываннем склонавых форм, які суправаджаецца дзеяннямі (“*Каму даць значок? – Тані, Алёшу, Валеру…*”). Дзеці паўтараюць форму слова за настаўнікам, замацоўваецца гукавая форма слова і яе сувязь з дзеяннем давання. Выкарыстанне разнастайных гульнявых сітуацыі таксама спрыяе засваенню склонавых форм.

Дзеяслоў вывучаецца з 3 па 9 клас. Гэта самая складаная часціна мовы. Праца над дзеясловамі пачынаецца ў 2 класе ў працэсе вывучэння тэмы “Словы, якія адказваюць на пытанне што рабіць?”. У часткі дзеяслова лексічнае значэнне супадае з граматычным *(бяжыць, лятае, ідзе* і г.д.). З такіх дзеясловаў і мэтазгодна пачынаць работу. Паступова ў дзяцей пачынае фарміравацца пашыранае разуменне дзеяння прадмета, уключаючы стан (*хварэць, спаць*), адносіны да іншага прадмета (*здзіўляцца, ганарыцца*), змяненне якасці (*зелянець, жаўцець*). Засвойваючы назвы дзеянняў, школьнікі вучацца карыстацца рознымі граматычнымі формамі дзеяслова.

У наступных класах уменне карыстацца рознымі граматычнымі катэгорыямі дзеяслова (лікам, часам, родам, асобай і інш.) фарміруецца на аснове маўленчых сітуацый, пытанняў, у гульнявой форме. Напрыклад: *“Нязнайка пераблытаў карткі са словамі. Атрымалася: Я бяжыш. Ён гулялі. Ты пішу. Дапамажы Нязнайку правільна пераставіць карткі.”*